**ПАВАРОТ НА ПРАВА**
Пра дзейнасць Юрыдычнай клінікі ў БДУ, дзе атрымалі дапамогу тысячы людзей
Стар. 2

**ГІСТОРЫІ САМАСТОЙНАГА РАЗМЕРКАВАННЯ**
Пра грамадзянскую актыўнасць і электаральную дасведчанасць студэнтаў
Стар. 3

**ВОПЫТ ЗАМЕЖНЫХ СТУДЭНТАЎ**
Пра вучобу замежных студэнтаў і іх уражанні ад універсітэта
Стар. 4

**АДОРАНАЯ МОЛАДЗЬ НА ХІМФАКУ**
Трое адораных студэнтаў хімфака расказалі свае гісторыі поспеху
Стар. 5

Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

*Пераможца V і XV Нацыянальных конкурсаў друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыях «Найлепшая шматтыражная газета», «Найлепшыя матэрыялы навуковай, навукова-папулярнай тэматыкі»*

24 чэрвеня 2024 года, № 6 (2284)




# ПРАПАНОВЫ БДУ ПА СУПРАЦОЎНІЦТВЕ Ў ГАЛІНЕ БІЯТЭХНАЛОГІЙ, МОЎНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ І РЭГІЁНАЗНАЎСТВА ПРАДСТАВІЛІ Ў КІТАІ



Прапановы БДУ па супрацоўніцтве ў галіне біятэхналогій, аховы здароўя, моўнай падрыхтоўкі і рэгіёназнаўства прадставілі ў Кітаі. З дадзенымі ініцыятывамі выступіў рэктар БДУ Андрэй Кароль на пасяджэнні беларуска-кітайскай асацыяцыі ўніверсітэтаў. Маштабная падзея прайшла ў г. Далянь (КНР). Беларускую дэлегацыю ўзначаліў міністр адукацыі Беларусі Андрэй Іванец.

Удзельнікамі пасяджэння асацыяцыі сталі рэктары каля 60 ВНУ Беларусі і Кітая. Дадзенае аб'яднанне створана ў лістападзе 2023 года з мэтай пастаяннага паглыблення абмену і супрацоўніцтва ў галіне вышэйшай адукацыі і навуковых даследаванняў паміж кітайскімі і беларускімі ўніверсітэтамі. У прыватнасці, прадугледжваецца садзейнічанне шматбаковаму міжуніверсітэцкаму ўзаемадзеянню, сумеснай падрыхтоўцы прафесійных і міждысцыплінарных спецыялістаў, публікацыі навуковых прац, арганізацыі мерапрыемстваў і інш.

Вынікам сустрэчы рэктараў ВНУ дзвюх краін стала стварэнне ў складзе асацыяцыі шасці тэматычных кластараў. Яны арыентаваны на сумеснае навуковае і адукацыйнае супрацоўніцтва ў разрэзе актуальных інавацыйных напрамкаў. Гэта лічбавыя тэхналогіі; інтэлектуальная вытворчасць; біятэхналогіі і ахова здароўя; эканамічная палітыка і кіраванне; дыялог цывілізацый і развіццё кітайскай і беларускай моў і рэгіёназнаўства. Ад беларускага боку Андрэй Кароль выступіў сумадэратарам секцыі па абмеркаванні пытанняў супрацоўніцтва ў галіне біятэхналогій і аховы здароўя. Кіраўнік БДУ адзначыў, што на дадзеным этапе чакаецца рэалізацыя чатырох сумесных праектаў з кітайскімі ВНУ і навуковымі інстытутамі. Гаворка ідзе пра структурную біялогію ацэтылхалінавых рэцэптараў; выяўленне малекулярных механізмаў раку крыві ў дзяцей; стварэнне мікраўгнаенняў на аснове квантавых кропак; даследаванне ўзаемадзеяння бактэрыя- і фітапланктону праз няклетачныя візікулы.

У перспектыве бачыцца магчымым пашырэнне партнёрства з Пекінскім універсітэтам, Кітайскай акадэміяй навук, універсітэтамі ў Фашані і Чжэньшэні за кошт адкрыцця сумесных аспірантур і магістратур. У БДУ ў цяперашні час толькі на біялагічным факультэце праходзяць падрыхтоўку шэсць аспірантаў з Кітая на спецыяльнасцях батаніка, мікрабіялогія, фізіялогія і біяхімія раслін, малекулярная біялогія, біяфізіка.

Адносна ўзаемадзеяння БДУ і кітайскіх ВНУ ў галіне моўнай падрыхтоўкі і рэгіёназнаўства на форуме прагучалі прапановы па ўкараненні інавацыйных тэхналогій навучання кітайскай мове і рускай мове як замежнай; рэалізацыі двухбаковага абмену магістрантамі; стварэння сумесных аўтарскіх калектываў па напісанні і выданні падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў па кітайскай мове, міжкультурнай камунікацыі, лінгвакраіназнаўстве і мастацкім перакладзе.

Акрамя таго, у рамках правядзення форуму адбудуцца міжуніверсітэцкія сустрэчы. У прыватнасці, рэктар БДУ правёў перамовы з калегамі з Далянскага політэхнічнага ўніверсітэта, Далянскага ўніверсітэта замежных моў, Гуйчжоўскага педагагічнага ўніверсітэта. Вынікам абмеркавання стала падпісанне мемарандума аб паразуменні паміж БДУ і Далянскім універсітэтам замежных моў. Заверылі дакумент кіраўнікі ВНУ Андрэй Кароль і Лю Хун адпаведна.

Мемарандум прадугледжвае развіццё абмену навучэнцамі па праграмах навучання ўсіх узроўняў, запрашэнне выкладчыкаў і даследчыкаў, стварэнне сумесных адукацыйных праграм, абмен інфармацыяй, вучэбнымі матэрыяламі і навуковымі справаздачамі і інш. Таксама дасягнуты афіцыйныя дамоўленасці з Гуйчжоўскім педагагічным універсітэтам па абмене навучэнцамі. Падпісаная дамова стала лагічным працягам мемарандума аб паразуменні, заверанага бакамі ў красавіку 2022 года.

Нагадаем, сёння Кітай з'яўляецца для БДУ адным са стратэгічных партнёраў, актыўна развіваюцца навуковыя, экспертныя і культурныя кантакты. Усяго ў БДУ дзейнічае 112 дамоў з 73 кітайскімі ўстановамі. Гэта больш за 18 % ад агульнай колькасці ўсіх міжнародных дамоў. Пры гэтым супрацоўніцтва з Кітаем мае станоўчую дынаміку. У канцы кастрычніка мінулага года на базе ФМА адкрылі Даследчы цэнтр ШАС, тут жа ўпершыню ў Беларусі былі створаны кафедры ўсходазнаўства і комплекснага вывучэння развіцця КНР.

Важным для ўмацавання беларуска-кітайскіх адносін стаў удзел БДУ ў якасці аднаго з заснавальнікаў новай Універсітэцкай сеткі навукова-даследчага супрацоўніцтва (iUNRC, Кітай). Яе адкрыццё адбылося напачатку лістапада 2023 года ў рамках I Міжнароднага кангрэса па навукова-тэхнічных абменах «Адзін пояс, адзін шлях». Акрамя таго, БДУ вельмі папулярны сярод кітайскіх грамадзян.

На сёння з больш чым пяці тысяч замежных студэнтаў самую важкую долю складаюць навучэнцы з Кітая – каля 3,4 тысяч.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

УНІВЕРСІТЭТ
24 чэрвеня 2024 года, № 6 (2284)

# ПАВАРОТ НА ПРАВА

Юрыдычная клініка ў БДУ

**Равесніца стагоддзя – менавіта так называюць Юрыдычную клініку ў БДУ, дзе за 24 гады атрымалі дапамогу тысячы людзей і набылі прафесійныя навыкі сотні студэнтаў. Пра работу падраздзялення і яго ролю ў станаўленні будучых прафесіяналаў пагутарылі з кіраўніком аддзела – намеснікам начальніка Цэнтра адукацыйных інавацый юрыдычнага факультэта Таццянай Навумовіч і самімі клініцыстамі.**

Гісторыю Юрыдычнай клінікі ў БДУ прынята адлічваць з 2000 года, калі выйшла пастанова Савета міністраў аб з'яўленні пры УВА грамадскіх прыёмных, куды маглі б звяртацца па юрыдычную дапамогу людзі з уразлівых катэгорый насельніцтва. Белдзяржуніверсітэт падтрымаў гэту ідэю адным з першых, і 1 снежня таго ж года падраздзяленне пачало працу.

Першы час юрклініка функцыянавала як практычная лабараторыя, дзе адшліфоўваліся прафесійныя навыкі студэнтаў. А ў 2020 годзе падраздзяленне прайшло рэарганізацыю і стала самастойным аддзелам Цэнтра адукацыйных інавацый юрыдычнага факультэта.





– Дзейнасць клінікі ахоплівае некалькі напрамкаў: адказ на пісьмы, вочныя кансультацыі грамадзян, праект «Права на кожны дзень» (прафарыентацыйныя сустрэчы са школьнікамі і іх бацькамі), а таксама прававое забеспячэнне працы стартап-напрамку БДУ. У межах «Права на кожны дзень» мы наведваем розныя навучальныя ўстановы Мінска, Віцебска, Свіслачы і іншых гарадоў, – тлумачыць Таццяна Навумовіч.

Летась юрыдычная клініка БДУ дала 89 кансультацый (178 сустрэч). Сюды звяртаюцца супрацоўнікі і студэнты ўніверсітэта, пенсіянеры, шматдзетныя сем'і, людзі, што знаходзяцца ў месцах пазбаўлення волі. Клініцысты нават паспелі набыць пастаянных кліентаў. Пра дзейнасць студэнтаў нярэдка можна пачуць па «сарафанным радыё»: іх рэкамендуюць сябрам, пра іх расказваюць у некаторых судах горада, органах сацыяльнай апекі, натарыяльных бюро.

Значная частка работы юрыдычнай клінікі прыпадае на вядзенне YouTube-канала «Паварот на права». Ідэя стварэння электроннай пляцоўкі ўзнікла ў кіраўніка падраздзялення ў 2021 годзе, а студэнты з энтузіязмам падхапілі задуму. Дарэчы, тэмы клініцысты выбіраюць самастойна – нярэдка зыходзячы з сітуацый, у якіх пабывалі яны ці іх знаёмыя. Затым студэнты пішуць сцэнарыі, выбіраюць лакацыі, здымаюць і манціруюць. Напрыклад, на канале юрклінікі можна знайсці адказы на пытанні, што рабіць кіроўцу, калі ён збіў ласё, што чакае чалавека, калі ён сарваў расліну, занесеную ў Чырвоную кнігу, як здаць квіткі на канцэрт і інш.

– Мы зразумелі, што многія пытанні, з якімі да нас звяртаюцца, дублююцца, таму на самыя папулярныя запыты сталі здымаць адукацыйныя відэаролікі. Так і нам не трэба марнаваць сілы на непатрэбную кансультацыю, і з кантэнтам можа пазнаёміцца любы ахвочы. Лічыце, колькі праглядаў на «юцюбе» – столькі і кансультацый. А іх больш за пяць тысяч, – заўважае дырэктар канала трэцякурсніца Валерыя Кухарчык. – Працягласць ролікаў не перавышае дзесяці хвілін, што робіць іх інфарматыўнымі і не рассейвае ўвагу гледачоў. Таксама стараемся, каб яны былі не кабінетнымі: каб лакацыі адпавядалі тэме роліка, а людзі адчувалі эфект прысутнасці. Самы папулярны, мабыць, ролік пра чэкі «Маёмасць».

У 2022 годзе канал стаў найлепшым медыйным рэсурсам, аднойчы праект атрымаў грант. Таксама ў скарбонцы юрклінікі быў грант на развіццё «Права на кожны дзень», які адзначаўся як бронзавы і сярэбраны пераможца конкурсаў «Найлепшы моладзевы праект БДУ» ў 2022 і 2023 годзе адпаведна.

Пра эфектыўнасць «Паварота на права» сведчаць водгукі тых, хто звяртаецца па кансультацыю («Глядзелі вашы відэа – дапамагло»). Некаторыя кліенты кажуць, што пасля прагляду адпадае патрэба сустракацца са студэнтамі-кансультантамі юрклінікі вочна. Былы дырэктар канала выпускнік юрыдычнага факультэта Даніла Штрапаў, да прыкладу, прыводзіць ролік пра выдачу бальнічнага ліста. У свой час хлопца прыемна здзівіла, што водгук пра актуальнасць відэа пакінуў нават яго бацька, якому яно дапамагло.

– Стварэнне кантэнту для канала таксама развівае ў нас прамоўніцкія навыкі, уменне прэзентаваць сябе. Мы юрысты, і, калі не зможам даходліва данесці нашы думкі да людзей, у прафесіі будзе складана. Цікава сачыць, як першы раз многім дыскамфортна, а пасля ўсе шукаюць дадатковыя магчымасці, каб зноў трапіць у кадр, – кажа Валерыя.

Сёння ў юрклініцы задзейнічана 80 студэнтаў (хаця яшчэ пару гадоў таму іх колькасць не перавышала дзесяці). Гэта стала магчымым, паколькі, стаўшы куратарам падраздзялення, Таццяна Навумовіч задумалася, чаму моладзь тут не затрымліваецца. Так нарадзілася ідэя ўвядзення ўнутры клінікі інстытута ментарства. З той пары за кожным «навічком» замацоўваецца старэйшы студэнт, які дапамагае ўліцца ў працу юрклінікі. Сёння на 12 ментараў прыходзіцца ад 2 да 6 новых удзельнікаў. Таксама вопытныя клініцысты займаюцца адборам «нававбранцаў»: сочаць, як малодшакурснікі падыходзяць да кансультацыі і наколькі сур'ёзна ставяцца да пытанняў. Але самае прыемнае, па словах Таццяны Уладзіміраўны, тое, што ў юрыдычнай клініцы застаюцца чацвёртакурснікі і магістранты, бо, калі студэнты адчуваюць сябе на сваім месцы – курс выбраны правільна.

– Таццяна Уладзіміраўна прымяншае сваю ролю, але з яе прыходам колькасць студэнтаў, задзейнічаных у юрклініцы, павысілася нават не ў два, а ў дзесяць разоў. І калі раней многія са скепсісам ставіліся да нашай дзейнасці (маўляў, вы яшчэ існуеце?), то зараз клініцыст – гэта званне, узровень адказнасці. Выкладчыкі кажуць, што, калі ты клініцыст, значыць, твой узровень ведаў значна вышэйшы. На факультэце вельмі паважаюць, калі акрамя вучобы ты яшчэ практычна замацоўваеш веды, – звяртаюць увагу маладыя людзі.

На сталах у працоўным кабінеце юрклінікі можна ўбачыць інструкцыю «Як размаўляць з кліентам». Тут прапісаны алгарытм камунікацыі, пачынаючы з «ало» і заканчваючы магчымымі адказамі суразмоўцы і адказамі на яго запыты. Перад першай кансультацыяй заўсёды разыгрываецца дзелавая гульня, дзе ролю кліента выконвае Таццяна Навумовіч. Падчас яе «навічкам» падказваюць наконт танальнасці голасу, фармулёўкі адказаў, магчымых форс-мажораў (дрэнны слых кліента, нядобразычлівасць і да т. п.). Студэнты пасля жартуюць, што кліенты слова ў слова паўтараюць, як на гульні.

Многім прафесійным правілам тут вучацца «з юрыдычнага маленства»: не бяруць арыгіналы дакументаў, не выносяць матэрыялы за сцены, не зацягваюць тэрміны падрыхтоўкі. І ніколі не сварацца – што б ні адбывалася паміж студэнтамі за межамі юрклінікі, гэта не павінна ўплываць на іх прафесійную дзейнасць.

Дарэчы, каб атрымаць дапамогу ад клініцыстаў, трэба патэлефанаваць па тэлефоне **209-55-23** і лаканічна апісаць праблему. Затым, калі пытанне знаходзіцца ў кампетэнцыі студэнтаў, вам прызначаць кансультацыю. Так, напрыклад, за выпадак не возьмуцца, калі ўзбуджана крымінальная справа, патрэбна даць ацэнку дзеянняў дзяржаўных органаў, трэба пісаць касацыйную скаргу і г. д.

Адказ на кожны зварот складаецца з двух частак: апытання-інтэрв'ю, дзе студэнты разглядаюць абставіны справы, збіраюць дакументы, і самой кансультацыі, якая праходзіць праз тыдзень – калі студэнты падрыхтуюць разгорнуты аналіз сітуацыі. Як правіла, адказы рыхтуюць ад 2 да 4 чалавек. Ёсць тут правіла: за адзін зварот кліент можа ўзняць не больш за пяць праблем.

Падчас размовы высвятляецца, што кожны ўдзельнік юрклінікі мае нейкую прафесійную адметнасць. Напрыклад, трэцякурсніца Настасся Савончык – унікальны студэнт у плане камунікацыі. Як толькі пачала гаварыць з першым кліентам – прысутным падалося, што яна займалася гэтым заўсёды. Мала хто ведае, але сюды дзяўчына прыйшла за кампанію з сяброўкай, а засталася, бо першае пісьмо яе вельмі ўразіла.

Пра чацвёртакурсніка Яна Кавалёва кажуць, што ён «чалавек-знаходка» – ува многім праз тое, што хлопец умее працаваць са складанымі кліентамі (дарэчы, у юрклініцы ён застаўся пасля праходжання практыкі яшчэ на 2 курсе). А ў мінулым годзе разам са сваім партнёрам па кансультацыях Ахмедам Тарсалтанавым быў прызнаны найлепшым клініцыстам. Студэнтка другога курса Аляксандра Рыбакова вучыцца на спецыяльнасці «паліталогія» і да прававых дысцыплін не мела прамога дачынення, але адразу ж загарэлася працай у юрклініцы менавіта таму, што тут вельмі паглыбляюцца ў глыбіні права.

– Калі трапляюцца складаныя кліенты, бывае, думаеш: «А яно мне трэба? Не буду болей браць кансультацый». Падыходзіш да Таццяны Уладзіміраўны: «Мы што, дрэнныя юрысты?» – здараецца, плачаш нават. А пасля пачуеш добрыя водгукі людзей, іншыя калегі падтрымаюць: «Ды колькі яшчэ такіх здарэнняў будзе!» – і ўсё зноў добра, – не без усмешкі расказваюць дзяўчаты. – Зараз, канешне, не рэагуем так, як спачатку. Таму вопыт рознага ўзаемадзеяння лепей пачынаць атрымліваць у студэнцтве, а не з прыходам на першае працоўнае месца. Гэта дазволіць не расчаравацца ў прафесіі. Нездарма Таццяна Уладзіміраўна любіць паўтараць формулу, што ідэальных кліентаў не бывае.

Здараюцца, канешне, і анекдатычныя выпадкі ў працы. Аднойчы звярнуўся мужчына, які сказаў, што хоча развесціся з жонкай, бо яна шлюбная махлярка, і ўсе 35 гадоў іх сумеснага жыцця цягнула з яго грошы. Пасля быў званок ад жанчыны з праблемай: «У мяне ў іншай краіне знік муж. Вашы студэнты могуць дапамагчы яго знайсці?»

– За ўвесь час не траплялася аднолькавых кансультацый. Мы заўсёды пашыраем свае веды, хаця яшчэ на другім курсе не маглі сабе ўявіць, што хутка зможам аказваць настолькі кваліфікаваную дапамогу. Пры гэтым не важна, хто да цябе звяртаецца, важна, што ты дапамагаеш, – дзеліцца Насця Савончык. – Да таго ж, клініка шмат дапамагае і ў вучобе. Неяк кліент задаў пытанне, ці можна адначасова атрымліваць пенсію ў Беларусі і Расіі пры розным стажы ў кожнай краіне. Прайшоў месяц – мне гэта задача трапіла на занятках па прадмеце «Сацыяльнае забеспячэнне». Я выдыхаю, успамінаю гэту сітуацыю, адказваю – атрымліваю добрую адзнаку. Паверце, пытанні кліентаў ніколі не забываюцца.

У юрклініцы існуе свая калекцыя – калі студэнты недзе вандруюць, з падарожжа заўсёды прывозяць званочак. Зараз ужо ніхто не памятае, хто прывёз першы з 56 «экспанатаў», але бачыцца, што нездарма менавіта званочак стаў негалосным сімвалам Юрыдычнай клінікі БДУ: гэты атрыбут часта дысцыплінуе гэтак жа, як студэнты дапамагаюць арыентавацца ў прававым полі. Таму не дзіўна, што яны, апісваючы сваю дзейнасць, кажуць, што без юрыдычнай клінікі не ўяўляюць студэнцкага жыцця.

**Ірына ІВАШКА**

# ГІСТОРЫІ САМАСТОЙНАГА РАЗМЕРКАВАННЯ

**Красавік – адказны месяц для выпускнікоў-бюджэтнікаў: падрыхтоўка да дзяржаўных іспытаў, абароны дыплома, а таксама размеркаванне, якое вызначыць, дзе маладыя спецыялісты будуць працаваць наступныя 2 гады. Хтосьці наглядаў сабе месца непасрэдна перад размеркаваннем, а хтосьці загадзя ўладкаваўся ў абраную кампанію.**

**Некалькі выпускнікоў расказалі, як яны шукалі сабе месца кар'ернага старту.**


Аляксандра Гарбунова


Ілья Мацюлька

**Аляксандра** вучылася на філалагічным факультэце на спецыяльнасці «беларуская філалогія (літаратурна-рэдакцыйны напрамак)». На папярэднім размеркаванні яе накіравалі ў Мінскі дзяржаўны мастацкі каледж імя А. К. Глебава настаўніцай беларускай мовы і літаратуры. Але з лютага 2024 года дзяўчына працуе рэдактарам у Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы. За невялікі час Аляксандра зарэкамендавала сябе як каштоўны спецыяліст, і кіраўнікі тэатра былі зацікаўлены, каб студэнтка пасля вучобы пайшла да іх. Таму Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь адаслала на факультэт пісьмо з просьбай размеркавання выпускніцы. Дадатковым важным фактарам стала тое, што вытворчую практыку на 3 курсе дзяўчына таксама праходзіла ў гэтым тэатры, у пісьме гэта было ўказана.

Да таго Аляксандра першыя 3 гады вучобы вяла актыўнае студэнцкае жыццё: валанцёрства, курыраванне і кіраўніцтва праектамі і падраздзяленнямі арганізацый, удзел у капэле БДУ і іншае. Але на размеркаванне гэтыя актыўнасці не ўплывалі.

– Было маральна складана чакаць вынікаў размеркавання: у галаве шмат пытанняў, сумневаў, адсутнасць дакладных адказаў. На канчатковым размеркаванні камісія, як мне тады здавалася, доўга прымала рашэнне. Але ўсё склалася добра, мяне размеркавалі туды, дзе я адчуваю сябе на сваім месцы. Размеркаванне – гэта не самы прыемны перыяд. Ён забірае сілы, нервы і час. Але для годнага студэнта камісія абярэ годнае месца адпрацоўкі. Добры сярэдні бал таксама вельмі дапамагае.

**Эрнэст** заканчвае механіка-матэматычны факультэт на спецыяльнасці «матэматыка (навукова-канструктарская дзейнасць)». Для многіх студэнтаў знаходжанне жаданага размеркавання можа быць цэлым выпрабаваннем, але яно не было такімі для хлопца. Ён лічыць, што ў адпрацоўкі заўсёды 2 праблемы: знайсці працу даспадобы і атрымаць дазвол на размеркаванне менавіта туды. І другая частка самая складаная, таму што ў факультэта свае патрабаванні і ўмовы, якім павінна адпавядаць арганізацыя, і часам у вас нават не бывае магчымасці самому знайсці працу, за цябе ўжо ўсё вырашана.

– На шчасце, на маім факультэце з гэтым значна прасцей. Нам для размеркавання дастаткова, каб твае абавязкі на знойдзенай рабоце адпавядалі спецыяльнасці. Жадаеш працаваць


Эрнэст Кнураў

праграмістам? Калі ласка. Жадаеш матэматыкам? На здароўе. Настаўнікам? Ды цябе з рукамі адарвуць. Вось гэтая частка далася мне лёгка, у мяне ўжо было месца працы, і я падаў заяўку на размеркаванне туды ж.

Працу Эрнэст шукаў ужо з другога курса. Спачатку ён патрапіў на стажыроўку, а потым і на паўнавартасную пасаду. Ён працуе ў IT і ведае, што знайсці месца нялёгка, трэба актыўна развівацца, каб адпавядаць стандартам і вялікай канкурэнцыі.

– Калі ёсць праца і вы добра сябе зарэкамендавалі, то арганізацыя можа хадайнічаць наконт вас. Гэта не абавязкова гарантуе, але павышае шанцы атрымаць жаданую адпрацоўку. Таму абавязкова шукайце працу загадзя, разглядайце розныя варыянты, спрабуйце і не здавайцеся. Бо студэнцтва на тое і дадзена, каб вучыцца жыццю.

Яшчэ да паступлення на эканамічны факультэт **Ілья Мацюлька** марыў апынуцца ў аўдытарскай кампаніі. У канцы 3 курса яму ўдалося патрапіць на лекторый ад кампаніі ТАА «БІ Аўдытарскія паслугі», і тады ён захацеў размяркоўвацца менавіта туды. У жніўні 2023 года Ілью прынялі на працу ў кампанію, дазволілі прайсці летнюю і пераддыпломную практыку. На іх ён са сваім навуковым кіраўніком сфармуляваў тэму для справаздачы, непасрэдна звязаную з тэмай дыпломнай працы – карпаратыўнай сацыяльнай адказнасцю.

Ілья лічыць, што яму пашанцавала з калегамі. Калі для дыплома інфармацыі не хапала, яны дапамагалі.

Перад размеркаваннем ён загадзя звярнуўся ў кадравы аддзел у кампаніі. У выніку хлопец без праблем і задоўга да размеркавання знайшоў сабе месца для пачатку кар'еры. Цяпер ён будзе працаваць спецыялістам кансультавання ў галіне суправаджэння здзелак.

– Мая парада выпускнікам: шукайце месца для размеркавання загадзя і яшчэ раней пачынайце задумвацца пра канкрэтную сферу і кампанію, у якой хацелі б пачаць прафесійную дзейнасць. Гэта дапаможа не хвалявацца ў напружаны перыяд размеркавання.

Часам на адным месцы размеркавання аказваюцца студэнты двух розных факультэтаў, з гэтага можа атрымацца цікавая гісторыя. Так і здарылася ў нашых наступных герояў.

У дзіцячым часопісе «Бярозка» сёлета шукалі размеркаванне двое студэнтаў: **Міхаіл Мурза** з факультэта журналістыкі і **Ганна Белая** з філфака.

Ганна з дзяцінства любіла часопіс «Бярозка», таму, калі надышоў час выбіраць месца працы, дзяўчына прапанавала ім сваю кандыдатуру на пасаду рэдактара. Міхаіл жа пачаў працаваць у часопісе яшчэ ў жніўні 2023 года і ніякага іншага месца для будучай адпрацоўкі не разглядаў. Ён загадзя дамовіўся з кіраўніцтвам, што застанецца ў часопісе пасля атрымання дыплома. Але высветлілася, што «Бярозка» не з'яўляецца адной з базавых арганізацый, якія маюць пераважнае права на маладых спецыялістаў. З размеркаваннем узніклі праблемы, і студэнтам прыйшлося звярнуцца да юрыста.

– Тры месяцы мы займаліся тым, каб зрабіць увесь Дом прэсы базавай арганізацыяй. Сабралі дакументы, напісалі дамову аб узаемадзеянні з БДУ. Недзе месяц мы чакалі ўнясення ўсіх правак, вынясення рашэння і заключэння дамовы. І нарэшце – у «Бярозку» стала магчыма беспераШкодна размяркоўвацца, – расказвае Міхаіл.

– На папярэднім размеркаванні студэнтам нярэдка адмаўлялі ў іх заяўках. Але калі студэнты даносілі ў дэканат усе патрэбныя дакументы, а працадаўцы выказвалі сваю зацікаўленасць у маладых спецыялістах, то большасць выпускнікоў атрымлівала размеркаванне, – дзеліцца вопытам Ганна.

Усе нашы героі адзначаюць, што адпрацоўка ў той арганізацыі, якую ты для сябе абраў – магчымасць развівацца ў жаданай сферы. Яна дае стабільнасць на наступныя 2 гады, а за гэты час можна зразумець, чаго ты хочаш ад сваёй кар'еры, пачувацца бяспечна і не турбавацца наконт пошуку працы.


Міхаіл Мурза

**Ганна КАЗАКОВА**

УНІВЕРСІТЭТ
24 чэрвеня 2024 года, № 6 (2284)

# ВОПЫТ ЗАМЕЖНЫХ СТУДЭНТАЎ

**Зараз у БДУ навучаецца каля 5300 замежнікаў. Гэта прыблізна пятая частка ад колькасці ўсіх студэнтаў. Многія з іх сутыкаюцца з цяжкасцямі студэнцкай міграцыі, але з адаптацыяй дапамагае савет зямляцтваў. Ён займаецца наладжваннем сяброўства і супрацоўніцтва паміж студэнтамі, арганізоўвае тэматычныя фестывалі, прэзентацыі, выставы і іншае.**

## У СКЛАД САВЕТА ЎВАХОДЗІЦЬ 8 НАЦЫЯНАЛЬНЫХ ЗЯМЛЯЦТВАЎ:

КІТАЙ
РАСІЯ
КАЗАХСТАН
УЗБЕКІСТАН
ТАДЖЫКІСТАН
ТУРКМЕНІСТАН
АЗЕРБАЙДЖАН
КРАІНЫ АФРЫКІ



З такой падтрымкай розніца менталітэтаў і культур не перашкода ў асваенні новых ведаў. Гэта даказваюць нашы студэнты з самых розных краін.

**Ахмед Таўсултанаў** вучыцца на 3 курсе юрыдычнага факультэта. Ён з Расіі, з Чачэнскай Рэспублікі. Ахмед – старшыня савета зямляцтваў.
— Калі я скончыў 11 класаў і здаў АДЭ ў Расіі, вырашыў, што хачу змяніць сваё жыццё, асяроддзе і пашырыць кругагляд, таму паступіў у іншую краіну.

Выбар, дзе вучыцца, у Ахмеда быў вялікі, але ён узгадаў пра БДУ. Пра сам універсітэт будучаму студэнту распавёў стрыечны брат – ён таксама вучыўся на юрфаку. Ужо ў Мінску ён пайшоў ва ўпраўленне міжнародных сувязяў БДУ, каб прайсці тэсціраванне і падаць дакументы. А факультэт абраў па жаданні душы. Ахмед прызнаецца, што ні паступленне, ні вучоба не выклікалі ў яго цяжкасцяў. А добразычлівасць беларусаў і перавагі Мінска не пакінулі падстаў сумнявацца ў выбары. У канцы мая мінулага года студэнта абралі старшынёй савета зямляцтваў. На пасадзе ён адчуў адказнасць і зразумеў, што хоча прыўнесці нешта новае ў арганізацыю і ствараць яшчэ больш спрыяльныя ўмовы для вучобы і пражывання ў краіне для замежных студэнтаў. Пасля вучобы Ахмед збіраецца займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю. Наўпрост па спецыяльнасці ён працаваць не плануе, але ні на секунду не шкадуе, што паступіў на юрыдычны факультэт. Ён лічыць, што веданне законаў дапаможа чалавеку ў любой жыццёвай сітуацыі.
– Важныя моманты для замежных абітурыентаў: памятайце, што БДУ ўваходзіць у 1% найлепшых ВНУ свету, і тут вы атрымаеце надзвычай карысныя навыкі і веды, бо кожны выкладчык у БДУ – прафесіянал сваёй справы; вы вучыцеся толькі для сябе, таму стаўцеся да вучобы сур'ёзна і адказна; БДУ заўсёды рады прыняць вас, а таксама жадае зрабіць ваша студэнцкае жыццё лягчэйшым і запамінальным. Таму з усімі пытаннямі вы заўсёды можаце звярнуцца ў савет зямляцтваў БДУ, адразу да мяне як да старшыні арганізацыі, ва ўпраўленне міжнародных сувязяў і ў прынцыпе да кіраўніцтва, бо кожны студэнт для БДУ як роднае дзіця!

**Аляксандра Ларыёс** вучыцца на другім курсе хімічнага факультэта. Яна родам з Нью-Ёрка, але Беларусь лічыць сваім другім домам. Яе маці беларуска, і раней яна часта прывозіла дачку на канікулы на радзіму. Дзяўчына цікавілася вучобай за мяжой і спынілася на БДУ.
– У ЗША я разглядала розныя ВНУ. Напрыклад, SUNY Binghamton, SUNY Stony Brook, Rutgers University, Cornell University і іншыя ў раёне штата Нью-Ёрк. Першапачаткова я збіралася вучыцца ў Rutgers па спецыяльнасці крыміналістычнай хіміі, але потым у мяне з'явілася магчымасць паступіць у ВНУ Беларусі і Расіі.

У выніку яна даведалася, што ў БДУ ёсць цікавыя ёй спецыяльнасці і магчымасць атрымаць добрыя веды. Ды і сам Мінск Аляксандры вельмі падабаецца, тым больш тут жывуць яе сваякі. Студэнтка адзначыла, што школьная адукацыя ў Штатах вельмі адрозніваецца ад беларускай.
– У Амерыцы вучоба складаецца з чатырох асноўных прадметаў: англійскай, матэматыкі, гісторыі (Social Studies – сацыяльныя навукі) і, што называецца, Science (аналагічны прадмету «Чалавек і свет»). Вучаць гэтыя прадметы з першага па восьмы клас з дадатковымі ўрокамі мастацтва і замежнай мовы. З дзявятага па дванаццаты клас у нас ёсць магчымасць браць розныя курсы. У 10 класе я вывучала пачатковую хімію, а ў 12 класе – на ўніверсітэцкім узроўні Advanced Placement Courses.

Паступіць у БДУ для амерыканкі аказалася не так складана. Галоўнай цяжкасцю стала вучэбная праграма. Да ўніверсітэта Аляксандра вывучала асновы неарганічнай хіміі. І, калі прыйшла на лекцыю па неарганіцы на першым курсе, усё, пра што яна даведалася за два гады ў ЗША, выкладчык ахапіў за тры лекцыі. Дзяўчына зразумела, што могуць узнікнуць праблемы з паспяховасцю.

Яшчэ адной цяжкасцю для Аляксандры стаў прафесійны моўны бар'ер. Хоць яна і ндрэнна размаўляе па-руску, але думае на англійскай.
– Руская лексіка вельмі адрозніваецца ад англійскай. У працэсе навучання я вельмі часта блытаю навуковыя тэрміны з англійскімі, таму мне часам складана сфармуляваць думку, калі адказваю на занятках.

Для замежных абітурыентаў Аляксандра дала сваю параду, як паспяхова вучыцца ў БДУ.
– Хоць атрымаць адукацыю можа на першы погляд здацца складаным, калі прыкладаць дастаткова намаганняў, то можна дасягнуць добрага выніку. Трэба ўкладвацца на ўсе сто, але і пра адпачынак не трэба забываць. Ва ўніверсітэце праводзяць шмат розных мерапрыемстваў, дзе кожны можа знайсці нешта цікавае. Абітурыентам не варта нічога баяцца. Адукацыя ў БДУ вельмі дапаможа ў будучыні. І памятайце, што супольнасць замежных студэнтаў заўсёды гатовая дапамагчы з любой праблемай.

**Уўганбаяр Эрдэмсайхан** – студэнт з Манголіі. Зараз ён вучыцца на другім курсе факультэта міжнародных адносін.

Хлопец пачаў вывучаць рускую мову яшчэ ў рускамоўным дзіцячым садку, пазней – у школе. Уўганбаяру ў старэйшых класах прапанавалі квоту на навучанне ў Расіі і Беларусі. Хлопец паступаў у абедзве краіны, разглядаў ВНУ ў Санкт-Пецярбургу і Маскве. Пазней яго прыняў універсітэт у Томску, а калі надышоў час канчаткова выбіраць, то абітурыент палічыў, што будзе цікавей вучыцца ў Беларусі.
– Хоць і здаецца, што прычын шмат, але насамрэч я не магу з дакладнасцю адказаць на пытанне, чаму я абраў БДУ. У адзін момант мне проста вельмі захацелася вучыцца тут. Мяне цягнула ў Беларусь. Магчыма, тут я мушу сустрэць свой лёс. Мяне прыцягвалі блізкае размяшчэнне да іншых краін Еўропы і стыпендыя. Дзякуючы квоце на навучанне, яна ў мяне вялікая. Мне падабаецца Мінск за яго чысціню і бяспеку.

Але спыняцца Уўганбаяр не плануе і пасля вучобы жадае пераехаць у іншую краіну і паспрабаваць сябе ў творчасці.
– Параю абітурыентам, якія таксама хочуць паступіць праз грант, не ленавацца і зарабляць добры сярэдні бал атэстата. Падрыхтуйцеся да іспытаў і сумоўя, тады ў вас абавязкова ўсё атрымаецца.

У кожнага з замежных студэнтаў свае прычыны навучацца ў БДУ. Але ўсіх іх аб'ядноўвае імкненне да пашырэння кругагляду, да якаснай адукацыі і таго неацэннага вопыту, які можа даць наш універсітэт.



**Ганна КАЗАКОВА**

# АДОРАНАЯ МОЛАДЗЬ НА ХІМФАКУ

**У 2024 годзе больш за 250 навучэнцаў БДУ занесена ў банк адоранай моладзі. У спісе можна знайсці студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў амаль з любога факультэта. На хімічным факультэце іх 35. Трое з іх расказалі свае гісторыі.**



## МАКСІМ СЫСОЕНКАЎ



## РЫГОР ГАРДУНОЎ



## АЛЯКСЕЙ ГАРАХОЎСКІ

У спісе таленавітай моладзі выпускнік пятага курса хімічнага факультэта знаходзіцца з восьмага класа. Тады ён і яшчэ пара чалавек атрымалі дыплом трэцяй ступені на рэспубліканскай НПК па хіміі. Пазней, у 11 класе, **Максім** атрымаў першае месца «на рэспубліцы» па хіміі і чатыры медалі на розных міжнародных алімпіядах. За гэтыя дасягненні яго занеслі ў фонд.

За час вучобы ва ўніверсітэце хлопец займаўся даследаваннямі ў розных галінах хіміі. Паспрабаваў сябе ў хіміі палімераў, потым займаўся біяхіміяй, а апошнім часам працаваў на кафедры фізічнай хіміі. Яго нядаўняе даследаванне прысвечана вывучэнню тэрмадынамічных уласцівасцяў аднаго са злучэнняў арылфуранавага шэрагу. Такія злучэнні актыўна даследуюцца, таму што ў іх даволі шырокі спектр прымянення: ад антымікробных уласцівасцяў да магчымага лячэння пернашчай гіпераксалурыі.

– Гэта хвароба зараз лечыцца толькі хірургічным шляхам. Ды нават не лечыцца, а хутчэй маскіруецца, таму што дзеці з такім захворваннем вымушаны ўсё астатняе не вельмі працяглае жыццё піць імунадэпрэсанты.

Акрамя навукі важнай часткай свайго жыцця Максім лічыць выкладанне. Ён пачаў рыхтаваць вучняў да алімпіяд яшчэ да паступлення ва ўніверсітэт. Сам хлопец прызнаецца, што тады гэта былі заняткі не самага высокага ўзроўню, але з таго часу шмат што змянілася. Спачатку яго вучнямі былі навучэнцы малодшых класаў гімназіі. Потым студэнт пяць гадоў рыхтаваў каманду Мінска да рэспубліканскіх алімпіяд па хіміі, сёлета яго паклікалі ўжо весці заняткі ў Мінскую і Віцебскую вобласці.

– Толькі зараз зразумеў, што шэсць гадоў – гэта доўга. Я зрабіў для алімпіяднікаў даволі шмат навучальных матэрыялаў, якія ім дапамагаюць у падрыхтоўцы. Нейкія ёсць у адкрытым доступе, нейкія за межы маіх навучальных модуляў далёка не ідуць, відома. Наогул, у планах напісаць свой дапаможнік для падрыхтоўкі да алімпіяд, але такія матэрыялы патрабуюць многа часу, а яго ніколі асабліва няма. Ну і апроч падрыхтоўкі, я і сам пішу і правяраю алімпіяды. Напрыклад, тры гады ўжо з'яўляюся аўтарам адной інтэрнэт-алімпіяды. У водгуках пішуць, што было цікава. Бадай, паверу ім.

Пра сваіх вучняў Максім можа расказваць бясконца. Тыя, якіх ён рыхтаваў – як падчас кароткіх збораў, так і даўжэй – узялі шмат дыпломаў і медалёў. Напрыклад, сёлета двое вучняў з Ліцэя БДУ атрымалі бронзавыя медалі на Міжнароднай Мендзялееўскай алімпіядзе па хіміі, якая прайшла ў Кітаі.

Нядаўна Максім прайшоў размеркаванне ў аддзел тэсціравання ACD/Labs. Выпускнік плануе і далей выкладаць, хаця і сам разумее, што з новай працай і графікам можа быць складаней.

У спіс адоранай моладзі чацвёртакурснік упершыню трапіў у дзявятым класе пасля перамогі на Рэспубліканскай алімпіядзе па хіміі. У 2021 годзе як студэнт удзельнічаў у алімпіядзе па вышэйшай матэматыцы сярод студэнтаў БДУ, дзе заваяваў дыплом першай ступені, а ў 2022 годзе атрымаў Прэзідэнцкую прэмію за заслугі ў вучобе і навуцы.

Калі **Рыгор** стаў студэнтам, то, акрамя вучобы, пачаў актыўна займацца навуковай дзейнасцю на кафедры арганічнай хіміі. Зараз яго навуковая дзейнасць звязана з вырашэннем праблемы сінтэзу дыгідрапірымідынонаў па мультыкампанентнай рэакцыі Біджынелі з далейшым вывучэннем біялагічнай актыўнасці атрыманых злучэнняў. Спектр іх біялагічных уласцівасцяў вельмі шырокі – ад супрацьгрыбковых да супрацьракавых прэпаратаў. Ад структуры малекул залежыць і ўласцівасць, якой яны будуць валодаць.

Даследчая група, у якой Рыгор працуе ўжо больш за два гады, займаецца гэтай праблематыкай, і на дадзеным этапе ёсць невялікая бібліятэка новых рэчываў.

– Гэта гетэрацыклічныя злучэнні, а менавіта вытворныя дыгідра(тыя)-пірымідынонаў, фрагменты якіх, як вядома, сустракаюцца ў асноўных будаўнічых блоках ланцужкоў ДНК і РНК. З гэтай прычыны дадзеныя злучэнні ўяўляюць сабой асаблівую цікавасць, бо іх біялагічная актыўнасць даказана in vivo, – расказаў студэнт.

Канкрэтна тыя злучэнні, якімі займаецца Рыгор, з некаторай верагоднасцю могуць валодаць шырокім спектрам фармакалагічнага дзеяння. Гэтыя ўласцівасці могуць быць антыаксідантныя, супрацьракавыя, антыфунгальныя, процілейшманіяльныя, антыбактэрыяльныя, супрацьвірусныя і многія іншыя. На дадзеным этапе мэта даследавання – сінтэзаваць злучэнні з вызначанай структурай. А ўжо тое, якімі яно будзе валодаць уласцівасцямі, пакажа далейшы біялагічны аналіз на пэўных лініях клетак і калоніях мікраарганізмаў.

– Рэальныя біявыпрабаванні яшчэ будуць праводзіцца, а пакуль што мы сінтэзуем бібліятэку такіх злучэнняў, каб потым зрабіць комплексны аналіз. Яшчэ шмат трэба зрабіць, аднак пачатак ужо пакладзены. Усе злучэнні будуць прааналізаваны in vitro на біялагічных асяроддзях (грыбкі, бактэрыі, ракавыя клеткі і г. д.), а пакуль што мы абмяжоўваемся in silico аналізам пры дапамозе камп'ютарнага мадэлявання структур.

Зараз Рыгор працягвае займацца навукай і плануе паступаць у магістратуру.

У банк адоранай моладзі магістрант хімічнага факультэта патрапіў яшчэ ў школе. Удзельнічаць у алімпіядах **Аляксей** пачаў у восьмым класе і адразу атрымаў перамогу на гарадской алімпіядзе. Праз год ён паўтарыў свой вынік. У дзявятым класе на рэспубліканскім узроўні Аляксей стаў першым у рэйтынгу. Але вяршыняй сваіх поспехаў ён лічыць перамогі ў міжнародных алімпіядах. За час вучобы ў школе Аляксей быў на сямі міжнародных алімпіядах па хіміі, і з кожнай з іх ён прывёз медаль. У яго скарбонцы чатыры залатыя, дзве сярэбраныя і бронзавая ўзнагарода.

Наконт паступлення ў БДУ магістрант канчаткова вызначыўся толькі ў 11 класе. Да гэтага Аляксей разглядаў розныя месцы. Гэта быў і хімфак МДУ, і іншыя маскоўскія ВНУ. У адзін час хлопцу хацелася быць хімікам-ядзершчыкам, хімікам-інжынерам, але ў 11 класе канчаткова зразумеў, што яго вабіць фундаментальная навука.

Вучоба, прызнаецца Аляксей, не была простай. Яму шмат што давалася лёгка, дапамог вялікі багаж ведаў і напрацаванага лагічнага мыслення, але былі пэўныя цяжкасці з убудоўваннем у агульную сістэму. Няпроста вучыцца разам з усімі, калі да гэтага выпрацаваў спосаб навучання менавіта пад сябе. Але хімфак студэнт скончыў з чырвоным дыпломам. Цяпер Аляксей займаецца даследаваннямі фотахімічных рэакцый тытанаарганічных злучэнняў.

– На хімфаку БДУ даволі моцная школа тытанаарганічнай хіміі. Як-ніяк рэакцыю Кулінковіча адкрылі менавіта ў нас. Плюс да ўсяго радыкальныя рэакцыі і фотахімія – гэта трэнд сучаснай хіміі, як і арганічная хімія ўвогуле. Падобныя рэакцыі дазваляюць выкарыстоўваць высокаактыўныя часціцы з адносна простых і танных рэагентаў для сінтэзу рэчываў розных класаў, найбольш цікавыя з якіх валодаюць біялагічнай актыўнасцю і з'яўляюцца патэнцыйнымі лекавымі сродкамі.

Аляксей плануе працягнуць даследаванні і паступова пашыраць сваю галіну дзейнасці. Па гэтай жа тэме ён збіраецца пісаць кандыдацкую і доктарскую дысертацыі. Праца ў лабараторыі дае хлопцу радасць самім фактам адкрыцця чагосьці новага, вывучэннем невядомага. Таксама ў перспектыве Аляксей хоча працаваць выкладчыкам на хімічным факультэце, паколькі лічыць неабходным і карысным інфармаваць людзей пра самыя перадавыя навуковыя адкрыцці і фарміраваць строгае навуковае мысленне. На думку нашага героя, гэта робіць чалавека паўнацэннай асобай, здольнай на змяненне свету да лепшага.

**Ганна КАЗАКОВА**

## НАВІНЫ

- Прэзідэнт сабраў пасяджэнне Савета бяспекі. На разгляд быў вынесены праект нарматыўнага прававога акта, звязанага з пытаннямі ацэнкі стану нацыянальнай бяспекі
- У Беларусь для ўдзелу ў парадзе да Дня Незалежнасці прыбылі вайскоўцы з Таджыкістана, Расіі і Кітая
- Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў ПАР Ігар Белы быў прыняты Прэм'ер-міністрам Каралеўства Эсваціні Расэлам Дламіні. Яны абмеркавалі рэалізацыю красавіцкіх дамоўленасцяў кіраўніка беларускай дыпмісіі з Каралём Эсваціні Мсваці III, а таксама праграму першага ў гісторыі двухбаковых адносін візіту Прэм'ер-міністра Эсваціні ў Беларусь
- Прэзентацыя страў беларускай кухні пройдзе ў дні святкавання 1050-годдзя Віцебска
- Тры беларускія метролагі ўдастоены звання «Заслужаны метролаг КООМЕТ» (Арганізацыі супрацоўніцтва дзяржаўных метралагічных устаноў краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы)
- Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка ўзнагародзіў супрацоўнікаў МНС за выратаванне людзей у вольны ад службы час
- Унікальная карціна Ільі Рэпіна «Беларус» з калекцыі Дзяржаўнага Рускага музея ўпершыню прадстаўлена ў Нацыянальным мастацкім музеі ў Мінску
- Беларускія скакуны ў ваду заваявалі пяць узнагарод Гульняў БРІКС
- Фундамент касцёла XVII стагоддзя знайшлі пры раскопках у Валожыне
- Нацыянальным каардынатарам па дасягненні Мэт устойлівага развіцця прызначаны Сяргей Хаменка
- Гродзенскія бібліятэкары стварылі 12 бібліяграфічных спісаў пра ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны
- Абмежаванні на наведванне лясоў уведзены ў 51 раёне Беларусі
- На II Міжнароднай выставе індустрыі бяспекі «Нацыянальная бяспека. Беларусь – 2024» 18 арганізацый НАН Беларусі прадставілі каля 150 інавацыйных распрацовак і тэхналогій

УНІВЕРСІТЭТ
24 чэрвеня 2024 года, № 6 (2284)



# ВЯРТАННЕ Ў ЮНАЦТВА

Ідэю наведаць геабазу «Заходняя Беразіна», дзе мой курс 1972 года паступлення праходзіў палявыя практыкі па шэрагу вучэбных дысцыплін, выказалі мае сябры Котава Таццяна і Сабалеўскі Аляксандр (сёння гэта муж і жонка). Праўда, адразу ідэя зводзілася да аўтаномнай паездкі на аўтамабілі з мэтай паглядзець, як змянілася геабаза, ці пазнаем мы яе праз 50 з лішнім гадоў. У мяне адразу ўзнікла думка, чаму б гэта наведванне не зрабіць больш глабальным. Звярнуліся з прапановай да аднакурснікаў і не пачулі практычна ніводнага адмоўнага адказу. Гэта яшчэ больш натхніла на рэалізацыю ідэі, і пачалася праца па яе рэальным увасабленні. Склалі план, вызначылі аргкамітэт, дзень і час ад'езду з Мінска і г. д.

Трэба адзначыць таксама некаторыя іншыя акалічнасці, якія паўплывалі на наш план. Па-першае, сёлета факультэт адзначае 90-годдзе свайго ўтварэння. У пастанове СНК БССР «Аб рабоце БДУ» ад 1934 года прадугледжвалася ўтварыць сярод іншых факультэт геалогіі, глебы і геаграфіі. Такім чынам, ён з'яўляецца адным з найстарэйшых факультэтаў універсітэта. Прайсці міма гэтай падзеі было немагчыма. Па-другое, мой курс быў па сутнасці першым, які праводзіў палявыя практыкі на створанай у 1973 годзе ў Валожынскім раёне вучэбнай геаграфічнай станцыі «Заходняя Беразіна» (так яна тады называлася). Па-трэцяе, маючы ў сваім складзе палкоўніка Аляксандра Лашука, за поспех планаванага мерапрыемства можна было не хвалявацца. З усёй адказнасцю магу сцвярджаць, што без яго актыўнага ўдзелу не абышлася ні адна папярэдняя сустрэча аднакурснікаў, а іх было некалькі, праўда, у Мінску. Гэта сапраўдны палкоўнік, які пасля вяртання з Афганістана яшчэ паспеў папрацаваць на розных пасадах у арміі, у тым ліку намеснікам начальніка ваеннага факультэта БДУ. Зразумела, што актыўна працавалі і іншыя мае аднакурснікі, якія ўваходзілі ў аргкамітэт.

Такім чынам, галоўнымі складовымі часткамі плана было: наведванне геабазы і экскурсія па ёй; сустрэча з сённяшнімі студэнтамі, якія праходзяць практыку; абед і адпачынак у адной з кавярань Валожына. Не магу не ўзгадаць усіх, хто браў удзел, і раблю гэта не з мэтай заняць старонкі газеты, а з удзячнасцю за іх адказнасць і салідарнасць, якую сёння рэдка сустрэнеш, тым больш у пенсійным узросце. Географы, яны не толькі лёгкія на пад'ём, але і ў стане яшчэ нагадаць пра сябе. Прозвішчы ўсіх маіх аднакурснікаў даю «дзявочыя» па групах і па алфавіце, зыходзячы з найбольшай колькасці чалавек: Першая група эканома-географаў – Наталля Жыгайла, Наталля Красло (была з мужам Яўгенам, які вельмі актыўна дапамагаў у рэалізацыі культурнай праграмы), Таццяна Лаўрук, Галіна Матус (актыўны арганізатар нашага харчавання ў кавярні), Таццяна Навуменка, Вячаслаў Сасноўскі (аўтар гэтых радкоў), Галіна Южык. Першая група фізіка-географаў – Марыя Васілюк, Аляксандр Кашынскі, Валянціна Мяшчэрская (самы актыўны грамадскі дзеяч на курсе ў студэнцкія гады і арганізатар гэтай сустрэчы), Наталля Паўлава, Аляксандр Сабалеўскі, Ніна Свістунова, Ірына Феакцістава. Другая група эканома-географаў – Галіна Арлоўская, Леанід Ігошын, Таццяна Котава, Люба Міцюкевіч, Ніна Сачкова, Лілія Сухадолец (прыклала вялікія намаганні ў пошуках памяшкання для абеду і яго арганізацыі). Трэцяя група фізіка-географаў – Аляксандр Лашук, Віктар Таляронак, Галіна Урбановіч, Надзея Янава (займалася бухгалтэрыяй мерапрыемства, і, як у адказнага бухгалтара, у яе ўсё сышлося, нават спадніца), Лілія Янкоўская (была з мужам Казімірам, з якім многія мае аднакурснікі былі ўжо знаёмыя з часоў сплаву па Заходняй Беразіне гадоў пяць таму). Другая група фізіка-географаў – Ала Крупская і Валянціна Лось.

Усе пералічаныя асобы жывуць у Беларусі, але ў розных яе рэгіёнах, і дабірацца да геабазы даводзілася як з Мінска на замоўленым аўтобусе (пераважная большасць), так і на ўласных аўтамабілях, цягнікам. Самыя аддаленыя гарады – Гомель, Віцебск, Жлобін, Ліда і Салігорск. Нягледзячы на кампактнасць тэрыторыі Беларусі, усё-такі для пенсіянера і 150–300 км – адлегласць. Заслугоўвае вялікай павагі ўчынак адной маёй аднакурсніцы, якой толькі два месяцы таму зрабілі аперацыю па замене каленнага сустава. Гэта сапраўдны прыклад адказнасці перад сваімі аднагрупнікамі, які ўсе прысутныя не маглі не заўважыць і ацаніць.

Асабліва хочацца адзначыць факт прысутнасці разам з намі кандыдата геаграфічных навук дацэнта Паўла Каўрыгі. Ніводная наша сустрэча без яго не абыходзілася. Ён правёў экскурсію па геабазе, распавёў пра метэаралагічныя назіранні студэнтаў у час практык. Усіх уразіў факт, што сёння існуе такі прыгожы рытуал, які здзяйсняюць студэнты кожную раніцу – уздымаюць рукі ўгару і выказваюць падзяку Богу словамі «хвала нябёсам». Напэўна, з-за такіх заклікаў у той дзень нас суправаджала цудоўнае сонечнае надвор'е.

Такім чынам, было нас 30 чалавек. Заўважу, што студэнтамі першага курса ў 1972 годзе сталі 125 чалавек. Ці магло быць больш? Напэўна, магло, калі б некаторыя мелі лепшы фізічны стан, а пэўная частка праявіла большую актыўнасць і адказнасць. Пры гэтым з сумам даводзіцца канстатаваць, што амаль кожны пяты з курса пакінуў ужо гэты свет (іх мы памянулі ў кавярні).

Што тычыцца выкладчыкаў, на вялікі жаль, тых, з кім некаторыя з нас сутыкаліся ў часы вучобы, засталося не шмат. Гэта дактары геаграфічных навук прафесары Галіна Марцінкевіч і Мікалай Чартко, кандыдаты геаграфічных навук дацэнты Павел Каўрыга, Натэла Кліцунова і Генадзь Смалякоў, старшыя выкладчыкі Лілія Мар'іна, Лілія Мельнікава і Зінаіда Панцялеева.

А цяпер пра само наведванне геабазы. Сказаць, што яна змянілася – гэта значыць нічога не сказаць. Калі б нас сюды «закінулі» з верталёта, мы б адразу не зразумелі, куды патрапілі, і ніколі б не пазналі свае «родныя пенаты». Бадай, самае вялікае ўражанне на ўсіх аказаў зменены ландшафт геабазы і найперш сосны, якія здзівілі не толькі сваёй колькасцю (у 70-я гады мы іх не заўважалі), а памерамі (вышыня іх не менш за 30 м). Сёння гэта сапраўдны сасновы бор! Не засталіся незаўважанымі і іншыя змененыя элементы ландшафту – адсутнасць прыродных сцежак, немагчымасць наўпрост выйсці на бераг ракі і інш. Другое вялікае ўражанне – інфраструктура. У нашы часы быў толькі адзін капітальны будынак – сталоўка, а жылі мы ў намётах. Ежу гатавалі самастойна ў армейскіх катлах. Усе камеральныя работы таксама ажыццяўлялі ў сталоўцы. Выкладчыкі, дарэчы, таксама не шыкавалі і жылі ў двух спісаных тралейбусах. Экскурсію па геабазе, як ужо адзначалася, правёў Павел Антонавіч, дзе мы ўбачылі сапраўдны студэнцкі гарадок, на тэрыторыі якога і адміністрацыйны корпус, і гасцініца, і інтэрнат, і лазня, і будынак для адпачынку з більярдам і сталом для для гульні ў настольны тэніс, і шмат чаго іншага. Здзівіла наяўнасць медпункта. Пра такі камфорт мы нават і не марылі. Аднак, калі казаць шчыра, практычна ўсім нам захацелася ў мінулае, у наша юнацтва, дзе жылі ў намётах па 5–8 чалавек, брыгадамі хадзілі на практыкі па глебазнаўстве, геалогіі, гідралогіі, біялогіі і іншых прадметах, кіно глядзелі на белай прасціне, а дыскатэкі адбываліся на свежым паветры. І што самае адметнае – не было ніякай агароджы і кожны меў магчымасць выйсці за межы геабазы і патрапіць у краму ў Філіпіняты, дзе набывалі не толькі прысмакі, але і імкнуліся зрабіць больш разнастайным асартымент напояў, не заўсёды безалкагольных, займацца спортам і фізкультурай. Усё гэта загартоўвала нас, рыхтавала да жыцця. Больш за тое, шмат маіх аднакурснікаў не толькі пазналі там каханне, але і стварылі трывалы падмурак пад далейшыя сямейныя адносіны. Невыпадкова ўжо на другім курсе з'явілася першая сямейная пара – гэта былі Дзмітрый і Ірына Ванеевы (на жаль, на гэтай сустрэчы іх не было). І такіх сямейных пар за ўсе гады вучобы было не менш за дзесяць. Прычым большасць шлюбаў з аднакурснікаў захаваліся па сёння.

Сустрэча са студэнтамі таксама адбылася, але не зусім у тым фармаце, які планаваўся. «Вінаваты» быў вучэбны працэс, а гэта значыць, што практычна ўсе студэнты (гэта звыш 100 чалавек) займаліся пабрыгадна сваімі непасрэднымі справамі. І толькі праз пэўны час, калі мы наблізіліся да ракі, сустрэліся на мосце праз Заходнюю Беразіну. Зразумела, гэта былі не ўсе студэнты, а толькі тыя, якія вярталіся на геабазу з геадэзічнай практыкі. Тым не менш ёсць падставы разглядаць яе як сустрэчу пакаленняў студэнтаў XX і XXI стагоддзяў, як эстафету, якую нам хацелася перадаць моладзі. Адбыўся кароткі абмен уражаннямі, праспявалі нават разам гімн геафака.

Пасля сустрэчы са студэнтамі мы накіраваліся ў прыгожы раённы цэнтр Беларусі – Валожын. Сёння тут пражывае звыш 10 тыс. чалавек, а вядомы ён з XIV ст. У адной з кавярань мы вырашылі падсілкавацца і падвесці вынікі нашай вандроўкі. Напэўна, гэта была самая вясёлая яе частка. Без перабольшвання магу сцвярджаць, што стол «ламаўся ад ежы», але ж і мы былі вельмі галоднымі. Прагучаў тост за поспех нашага мерапрыемства, а затым пачалі дзяліцца ўражаннямі, успамінамі, а праз гадзіну заспявалі і нават кінуліся ў скокі. Такога эмацыйнага ўздыму ў нас не было, бадай, за ўсю гісторыю нашых папярэдніх сустрэч. Камсарг нашай групы ў гады студэнцтва Галіна Матус прачытала верш, староста Наталля Красло з мужам Яўгенам пад гітару выканалі песню, правялі нават конкурс накшталт «Што? Дзе? Калі?», які разглядалі як сродак у барацьбе з магчымай дэменцыяй. Адным словам, адвялі душу і хоць на невялікі час забыліся пра свае жыццёвыя клопаты і турботы.

Правільная арганізацыя і адказнасць усіх удзельнікаў мерапрыемства дазволілі ўсё ажыццявіць і вярнуцца ў Мінск а 18 гадзіне. Завяршыць свой нарыс мне б хацелся вершам усё той жа Галіны Матус, якая здолела ў ім перадаць паэтычнымі радкамі «эпоху» нашага студэнцкага жыцця:

## НЕЗАБЫЎНАЕ

Часам хочаш вярнуцца назад у часы тыя даўнія, дзіўныя…
Успамінаў праносіцца рад, усплывае заўжды незабыўнае.
Маладосці, юнацтва гады прамільгнуць у вачах плынню яснаю,
Для мяне і цябе назаўжды яны векаю сталі нязгаснаю.
Хіба ж можна адкінуць, забыць тое светлае, сціплае, брацкае,
Дзе прыйшлося з сябрамі дзяліць лусту хлеба і шчасце юнацкае.
Ах юнацтва былога гады… Мы такія былі непакорныя.
Нас рамантыка клікала ўвысь да вяршыняў жыцця непаўторнага.
І, напэўна, нас час не змяніў – усё такія ж узнёслыя, смелыя,
Толькі скроні крыху пабялі, ды ў працы ўсё болей умелыя.
А Карпаты, Урал і Каўказ, Крым, Байкал і Саяны далёкія…
Мы ўспомнім яшчэ іх не раз звонкім голасам, песняй высокаю.
Што хачу я, сябры, вам сказаць у часы гэтай нашай сустрэчы,
Толькі шчасця, дабра пажадаць, і ў жыцці каб было ўсё дарэчы,
А жыццё – гэта наш капітал, дык няхай ён яшчэ прырастае.
І не раз серабрысты бакал за сяброўскім сталом нас збірае.

**Вячаслаў САСНОЎСКІ,**
**кандыдат геаграфічных навук, дацэнт**



# ДАСЛЕДЧЫК РОДНАЙ МОВЫ З ФІЛФАКА

У сваім хатнім фотаархіве адшукаў вось гэты здымак. На ім адлюстраваны мой куратар з філалагічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта Міхей Мікалай Дзмітрыевіч. Здымак быў зроблены напачатку 1980-х гадоў.

Чаму я прыгадаў свайго выкладчыка і куратара? Ды таму, што летась 22 жніўня Мікалаю Дзміртыевічу споўнілася 85 гадоў. Божа ж ты мой, як хутка бяжыць час. А ён бачыцца і сёння перад вачыма: невысокага росту, у касцюме з гальштукам, у руках заўсёды нешта трымае, у акулярах, спакойны і ветлівы. Вось такі, як на фотаздымку.

Мікалай Міхей быў куратарам нашай чацвёртай групы. Ён забягаў да нас, каб запытацца, якія ёсць пытанні ці праблемы, а потым непрыкметна знікаў. Ён не надакучваў нам выхаваннем, вучобай, узаемаадносінамі ў калектыве. Ён любіў нас такіх, якія мы былі, а мы ў сваю чаргу вельмі паважалі яго. Ён лічыў нас дарослымі, сур'ёзнымі і самастойнымі. А калі ў каго з'яўляцца праблемы – дапаможа іх вырашыць адзін на адзін.

Але ў той жа час ніхто з нас не цікавіўся, чым займаецца Мікалай Дзмітрыевіч, што даследуе, над чым працуе, адкуль ён родам. Мы, маладыя студэнты, жылі сваімі клопатамі і справамі. Толькі цяпер, калі прайшло шмат гадоў, мяне зацікавіў мой былы выкладчык. Гляджу на гэты фотаздымак, і такая настальгія па мінулых студэнцкіх гадах, вучобе нахлынула, што аж сэрца спыняецца ад думак. Цяпер такіх выкладчыкаў няма. А мяне вучылі Ніл Гілевіч, Алег Лойка, Сцяпан Александровіч, Рыгор Семашкевіч, Адам Супрун, Таццяна Шамякіна, Любоў Тарасюк, Вячаслаў Рагойша, Кузьма Хромчанка, Маргарыта Яфімава, Людміла Карпава, Святлана Любіч, Мікалай Паўленка, Аляксандр Станюта, Вячаслаў Каладзінскі і іншыя. Яшчэ першакурснікам напісаў такія радкі: «Мой БДУ – маё дыханне, мая надзея на даляглядзе...» Але сёння часцей за ўсё прыгадваюцца радкі прафесара Алега Лойкі: «Думаў я, усё наперадзе, аказалася – ззаду...» І гэта, сапраўды, так...

Калі б вярнуўся той час, я абавязкова пагутарыў бы з Мікалаем Дзмітрыевічам. Папрасіў бы яго, каб ён распавёў пра сваю знакамітую вёску Нянькава з Навагрудчыны, дзе нарадзіўся ў сялянскай сям'і 22 жніўня 1938 года.

Вучыўся вясковы хлопчык спачатку ў Нянькаўскай пачатковай школе, потым у Асташынскай сямігодцы і ў беларускай школе ў Навагрудку. У 1951 годзе паступіў на філалагічны факультэт БДУ. Сумяшчаў напачатку вучобу з працай у газеце «Калгасная праўда»: быў падчытчыкам, карэктарам, літаратурным рэдактарам. Пасля ўніверсітэта вучыўся ў аспірантуры на кафедры беларускай мовы БДУ. А з 1961 года выкладаў на гэтай кафедры.

Друкавацца Мікалай Міхей пачаў з 1968 года. Ён даследаваў праблемы сінтаксісу беларускай мовы, методыку яе выкладання ў сярэдніх і вышэйшых навучальных установах. Адзін і ў суаўтарстве напісаў і выдаў дапаможнікі «Разбор сказа», «Сінтаксічная сувязь слоў у сказе», «Сучасная беларуская мова», «Некаторыя асаблівасці беларускай літаратурнай мовы на сучасным этапе (па матэрыялах мінскай перыёдыкі)», «Субстантывацыя прыметнікаў і дзеепрыметнікаў у сучаснай беларускай літаратурнай мове» і іншыя.

Разам з Мікалаем Дзмітрыевічам Міхеем на філалагічным факультэце працаваў яго зямляк з Нянькава Уладзімір Міхайлавіч Лазоўскі (1934 – 2007). Ён працаваў намеснікам дэкана філалагічнага факультэта. Але навуковымі інтарэсамі яго былі такасама сучасная беларуская мова, праблемы беларускай лексікалогіі, фразеалогіі, лексікаграфіі, тэарэтычныя праблемы беларускай мовы і беларускай лінгвадыдактыкі.

Наогул, вёска Нянькава на Навагрудчыне, дзе нарадзіўся Мікалай Міхей, цэлае гняздо таленавітых людзей.

Калі ехаць з Навагрудка ў бок Любчы, пасля павароту на вёску Нянькава, з правага боку каля самай дарогі можна заўважыць валун, агароджаны плотам. На валуне ёсць шыльда з надпісам, што на гэтым месцы жыў вядомы вучоны Уладзіслаў Дыбоўскі (1838 – 1910). Ён нарадзіўся ў маёнтку Адамарын на Маладзечаншчыне. 25-гадовы Уладзіслаў Дыбоўскі за ўдзел у паўстанні ў 1863 годзе быў асуджаны да турэмнага зняволення. З 1871 года ён працаваў у Тартускім універсітэце ў Эстоніі. У 1878 годзе Дыбоўскі становіцца доктарам мінералогіі, але з-за хваробы сэрца пакідае працу. Ён пераязджае на Навагрудчыну ў маёнтак Нянькава.

Уладзіслаў Дыбоўскі вывучаў раслінны свет, даследаваў флору і фаўну Навагрудчыны. А з дапамогай сваёй сястры, якая ў той час жыла ў маёнтку Войнава, непадалёк ад Любчы, ён сабраў багаты гербарый, які потым быў перададзены ў Кракаўскі універсітэт. Уладзіслаў Дыбоўскі быў вядомы не толькі як навуковец, але і як збіральнік беларускага фальклору, ён выдаў кнігу «Беларускія прыказкі з Навагрудскага павета». У 1989 годзе Станіслаў Галакціёнаў і Ганна Яцкевіч выдалі кнігу пра Уладзіслава Дыбоўскага, якую яны так і назвалі – «Рыцар навукі з Нянькава».

Жыў у Нянькаве ў XX – пачатку XXI стагоддзя і фатограф Ян Комар, які здымаў фотаапаратам «Зеніт-С» на вузкую чорна-белую стужку родную вёску. Здымаў ён яе з 1950-х да сярэдзіны 1970-х гадоў.

З Нянькавам звязана маленства і школьныя гады доктара гістарычных навук, беларускага культуролага і мастацтвазнаўца Міколы Нікалаева. Ён закончыў гістарычны факультэт БДУ. Працуе ў Расійскай нацыянальнай бібліятэцы, узначальвае аддзел рэдкіх кніг, з'яўляецца старшынёй Санкт-Пецярбургскай асацыяцыі беларусістаў. Выдаў цудоўныя кнігі «Палата кнігапісная» (1993), «Беларускі Пецярбург» (2009), «Кніга цудаў Наваградскай іконы Багародзіцы як помнік гісторыі XVII стагоддзя. Даследаванне і тэкст» (2015) і іншыя.

Наогул, пра філолага Мікалая Міхея, яго знакамітых землякоў і вёску Нянькава можна напісаць цэлую кнігу-даследаванне. Усіх іх яднала і яднае любоў да сваёй малой радзімы і да ўсёй Беларусі.

**Сяргей ЧЫГРЫН,**
**выпускнік філфака БДУ 1985 года**



# БДУ вачыма абітурыента

БДУ – гэта месца, дзе мары і амбіцыі маладых людзей пачынаюць ператварацца ў рэальнасць. Для абітурыента гэта не проста навучальная ўстанова, але і месца, дзе пачынаецца новы этап жыцця, поўны магчымасцяў і выклікаў. Першае, што кідаецца ў вочы абітурыенту пры паступленні ва ўніверсітэт, гэта велізарная колькасць новых людзей, ідэй і перспектыў. У БДУ можна пазнаёміцца з рознымі культурамі, традыцыямі і меркаваннямі. Гэта выдатная магчымасць пашырыць свой кругагляд і стаць больш адкрытым і талерантным чалавекам. Аднак універсітэт – гэта не толькі месца для зносін і сацыялізацыі. Тут абітурыент можа раскрыць свой інтэлектуальны патэнцыял і развіць свае прафесійныя навыкі. Навучальны працэс патрабуе ад студэнтаў самастойнасці, настойлівасці і працавітасці. Абітурыент усведамляе, што поспех ва ўніверсітэце залежыць ад яго ўласных намаганняў і імкнення да ведаў.

Нядаўна мне давялося наведаць факультэт журналістыкі. І гэта аказалася для мяне захапляльным і натхняльным вопытам. Пасля сустрэчы з выкладчыкам і студэнтамі мне стала відавочна, што факультэт журналістыкі – гэта цэлая супольнасць людзей, якія падзяляюць запал да слова, інфармацыі і камунікацыі. Разнастайнасць прафесійных інтарэсаў і талентаў студэнтаў уразіла мяне: тут можна сустрэць будучых рэпарцёраў, рэдактараў, фотажурналістаў і нават блогераў.

Асабліва мяне натхніла тое, як выкладчыкі стымулююць студэнтаў да самавыяўлення і крэатыўнасці. Яны не толькі дзеляцца сваім вопытам і ведамі, але і заахвочваюць эксперыментаваць, шукаць новыя падыходы да журналісцкай дзейнасці і развіваць уласны стыль. Акрамя таго, я была ўражаная сучаснымі тэхналогіямі, якія даступныя студэнтам на факультэце. Магчымасць працаваць з прафесійным абсталяваннем і праграмным забеспячэннем ужо падчас вучобы дае студэнтам перавагу і каштоўны вопыт для будучай кар'еры.

Універсітэт даў мне яркія ўражанні. Я пераканалася, што гэта месца, дзе можна атрымаць якасную адукацыю, а таксама знайсці аднадумцаў, натхненне і падтрымку для сваёй творчасці.

БДУ, чакай мяне!

***Лізавета РАМАНЬКОВА***

# БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ АБ’ЯЎЛЯЕ КОНКУРС

## НА ЗМЯШЧЭННЕ ПАСАД ПРАФЕСАРСКА-ВЫКЛАДЧЫЦКАГА СКЛАДУ

| Найменне пасады | Кваліфікацыйныя патрабаванні да пасады паводле АКДП і службовай інструкцыі |
|---|---|
| **Загадчык** | Вышэйшая адукацыя, наяўнасць навуковай ступені доктара ці кандыдата навук, навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 7 гадоў. |
| | 2 На пасаду загадчыка кафедры прызначаецца асоба, якая мае вышэйшую адукацыю, вучоную ступень доктара або кандыдата навук, навуковыя працы, стаж работы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў або спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 7 гадоў. |
| **Прафесар** | Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац і вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасад кіраўнікоў ці спецыялістаў, якія адпавядаюць напрамку адукацыйнай дзейнасці кафедры, не менш за 7 гадоў. |
| | 3 Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 7 гадоў; валоданне беларускай і рускай мовамі, а таксама не менш чым адной замежнай мовай у аб’ёме, неабходным для выканання сваіх службовых абавязкаў |
| **Дацэнт** | Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац і вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасад кіраўнікоў ці спецыялістаў, якія адпавядаюць напрамку адукацыйнай дзейнасці кафедры, не менш за 5 гадоў. |
| | 4 Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 5 гадоў; валоданне беларускай і рускай мовамі, а таксама не менш чым адной замежнай мовай у аб’ёме, неабходным для выканання сваіх службовых абавязкаў |
| **Выкладчык** | Вышэйшая адукацыя і наяўнасць ступені магістра (вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай кваліфікацыі «Даследчык», вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай ступені) і стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў не менш за 1 год; валоданне беларускай і рускай мовамі, а таксама не менш чым адной замежнай мовай у аб’ёме, неабходным для выканання сваіх службовых абавязкаў |
| **Старшы выкладчык** | На пасаду старшага выкладчыка прымаецца асоба, якая мае вышэйшую адукацыю і стаж працы на пасадах педагагічных работнікаў, пасадах кіраўнікоў або спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 3 гады |
| | 5 Вышэйшая адукацыя і наяўнасць ступені магістра (вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай кваліфікацыі «Даследчык», вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай ступені), стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў не менш за 3 гады або вышэйшая адукацыя і стаж працы на пасадах службоўцаў, якія адносяцца да катэгорыі «Кіраўнікі» ці «Спецыялісты», праца якіх адпавядае напрамку адукацыі, не менш за 5 гадоў; валоданне беларускай і рускай мовамі, англійскай мовай і, як правіла, іншай замежнай мовай у аб’ёме, неабходным для выканання сваіх службовых абавязкаў |

**Гістарычны факультэт аб’яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад ПВС:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду [1] |
|---|---|
| Загадчык кафедры гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу | 5 гадоў |
| Загадчык кафедры гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры крыніцазнаўства | 5 гадоў |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе:
Гістарычны факультэт, вул. Мендзялеева, 36, аўд. 103; да 23 ліпеня.

Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу:
Гістарычны факультэт, вул. Мендзялеева, 36, аўд. 103; да 22 жніўня.

**Факультэт міжнародных адносін аб’яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад ПВС:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду [1] |
|---|---|
| Загадчык кафедры мытнай справы БДУ | 5 гадоў |
| Загадчык кафедры міжнародных адносін БДУ | 5 гадоў |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе:
г. Мінск, вул. Ленінградская, 20, каб. 504; да 23 ліпеня.

Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу:
г. Мінск, вул. Ленінградская, 20, каб. 516; да 22 жніўня.

**Хімічны факультэт аб’яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад ПВС:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду [1] |
|---|---|
| Прафесар кафедры аналітычнай хіміі | 2 гады |
| Дацэнт кафедры неарганічнай хіміі | 3 гады |
| Дацэнт кафедры неарганічнай хіміі | 1 год |
| Дацэнт кафедры неарганічнай хіміі | 1 год |
| Старшы выкладчык кафедры электрахіміі | - |
| Дацэнт кафедры неарганічнай хіміі | 1 год |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе:
г. Мінск, вул. Ленінградская, 14, каб. 203; да 23 ліпеня.

Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу:
г. Мінск, вул. Ленінградская, 14, каб. 203; да 22 жніўня.

**Факультэт філасофіі і сацыяльных навук аб’яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад ПВС:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду [1] |
|---|---|
| Загадчык кафедры сацыяльнай камунікацыі | 1 год |
| Дацэнт кафедры сацыяльнай і арганізацыйнай псіхалогіі | 1 год |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе:
г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, к. 528; да 23 ліпеня.

Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу:
г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, к. 528; да 22 жніўня.

**Факультэт сацыякультурных камунікацый аб’яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду [1] |
|---|---|
| Прафесар кафедры культуралогіі | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры экалогіі чалавека | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў | 5 гадоў |
| Старшы выкладчык кафедры англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў | - |
| Старшы выкладчык кафедры камп’ютарнай лінгвістыкі і лінгвадыдактыкі | - |
| Старшы выкладчык кафедры камунікатыўнага дызайну | - |
| Старшы выкладчык кафедры дызайну моды | - |
| Выкладчык кафедры камп’ютарнай лінгвістыкі і лінгвадыдактыкі | - |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе:
г. Мінск, вул. Акадэміка Курчатава, 5, кабінет 208; да 23 ліпеня.

Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу:
г. Мінск, вул. Акадэміка Курчатава, 5, кабінет 409а; да 22 жніўня.

**Філалагічны факультэт аб’яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад ПВС:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду [1] |
|---|---|
| Прафесар кафедры рускай літаратуры | 3 гады |
| Прафесар кафедры гісторыі беларускай літаратуры | 5 гадоў |
| Прафесар кафедры англійскага мовазнаўства | 3 гады |
| Дацэнт кафедры кітайскай філалогіі | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры англійскага мовазнаўства | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры англійскага мовазнаўства | 1 год |
| Дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства | 1 год |
| Дацэнт кафедры прыкладной лінгвістыкі | 1 год |
| Дацэнт кафедры рускай мовы | 1 год |
| Выкладчык кафедры раманскага мовазнаўства | - |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе:
вул. К. Маркса, 31, кабінет 34 да 23 ліпеня.

Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу:
вул. К. Маркса, 31, кабінет 62; да 22 жніўня.

**Інстытут бізнесу БДУ аб’яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад ПВС:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду [1] |
|---|---|
| Дацэнт кафедры інавацыйнага кіравання | 3 гады |
| Старшы выкладчык кафедры маркетынгу | - |
| Старшы выкладчык кафедры бізнес-адміністравання | - |

Месца (адрас) прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе:
220004, г. Мінск, вул. Шпалерная, 7, каб. 203, да 23 ліпеня.

Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу:
220004, г. Мінск, вул. Шпалерная, 7, каб. 213, да 22 жніўня.

### НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЯ ЎСТАНОВА «ІНСТЫТУТ ПРЫКЛАДНЫХ ФІЗІЧНЫХ ПРАБЛЕМ ІМЯ А. Н. СЕЎЧАНКІ» БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА АБ’ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ВАКАНТНЫХ ПАСАД:

1. Навуковага супрацоўніка лабараторыі оптыка-фізічных вымярэнняў па спецыяльнасці 01.04.01 «Прыборы і метады эксперыментальнай фізікі» – 1 адзінка;
2. Навуковага супрацоўніка лабараторыі оптыка-электронных сістэм па спецыяльнасці 01.04.01 «Прыборы і метады эксперыментальнай фізікі» – 1 адзінка.

Месца (адрас) прыёму заяў для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. Курчатава, 7, каб. 230, да 23 ліпеня.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г. Мінск, вул. Курчатава, 7, каб. 230, да 22 жніўня.

---

### Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт аб’яўляе прыём для атрымання навукова-арыентаванай адукацыі ў аспірантуры (дзённы, завочнай і ў форме саіскальніцтва) і дактарантуры (дзённы і ў форме саіскальніцтва) у 2024 годзе.

Асобы, якія паступаюць у аспірантуру для навучання ў дзённай ці завочнай форме атрымання адукацыі, здаюць уступны іспыт па спецыяльнай дысцыпліне.

Кандыдацкія іспыты і залік па агульнаадукацыйных дысцыплінах павінны быць здадзены да паступлення ў аспірантуру.

Для атрымання навукова-арыентаванай адукацыі ў аспірантуры ў форме саіскальніцтва здача ўступнага іспыту не патрабуецца. Наяўнасць здадзеных кандыдацкіх іспытаў па агульнаадукацыйных дысцыплінах не абавязковая.

Асобы, якія паступаюць у аспірантуру для навучання ў завочнай форме атрымання адукацыі і ў форме сасікальніцтва, павінны мець досвед практычнай працы не менш за два гады на пасадах, што патрабуюць наяўнасці вышэйшай адукацыі.

У дактарантуру прымаюцца асобы, якія маюць навуковую ступень кандыдата навук і з’яўляюцца аўтарамі навуковых артыкулаў, а таксама іншых матэрыялаў па выніках навуковых даследаванняў (манаграфій, матэрыялаў, якія адносяцца да аб’ектаў інтэлектуальнай уласнасці, зарэгістраваных у вызначаным парадку, матэрыялаў і (ці) тэзісаў дакладаў на канферэнцыях, справаздач пра выкананыя даследаванні і распрацоўкі, актаў (даведак) пра іх выкарыстанне, што пацвярджаюць удзел у выкананні дзяржаўных праграм навуковых даследаванняў, навукова-тэхнічных праграм і інавацыйных праектаў па прыярытэтных напрамках навуковых даследаванняў або прыярытэтных напрамках навукова-тэхнічнай дзейнасці), якія складаюць аснову для доктарскай дысертацыі.

Падрабязная інфармацыя па плане і правілах прыёму размешчана на сайце БДУ (http://www.bsu.by).

Даведкі праз тэлефон: +37517 209-51-73, +37517 209-50-24.

Прыём дакументаў ажыццяўляецца з 1 жніўня па 30 верасня 2024 года па адрасе: г. Мінск, вул. Бабруйская, 9, к. 414, 419.

Час працы аддзела аспірантуры і дактарантуры:
панядзелак–чацвер з 8:30 да 13:00 і з 13:45 да 17:15,
пятніца з 8:30 да 13:00 і з 13:45 да 17:00.

[1](дацэнт, прафесар, намеснік загадчыка агульнаўніверсітэцкай кафедры, загадчыка кафедры)

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

Падпісана да друку 24.06.2024 г.
Зак. 596. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана на Дзяржаўным прадпрыемстве «БудМедыяПраект».
ЛП № 02330/71 ад 23.01.2014 220123,
Мінск, вул. В. Харужай, 13/61.

Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК

Адрас рэдакцыі: 220004, г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, каб. 804, 802, тэл. 259-70-77, 259-70-65
*e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by*